# З А Я В А

народных дэпутатау БССР ад
апазIцыI Беларускага Народнага Фронту
у Вярхоуным Савеце Беларускай ССР

У ноч з I8 на I9 жнIуня г.г. у Маскве шэрагам асоб, якIя займаюць адказныя дзяржауныя пасты Саюза ССР, зроблена спроба дзяржаунага перавароту. Гэтая спроба парушае арт.$127^3$ п.I5 дзейнай КанстытуцыI СССР I арт.I2 Закона Саюза ССР "Аб прававым рэжыме надзвычайнага становIшча". Згодна з гэтымI заканадаучымI актамI ПрэзIдэнт Саюза ССР можа абвяшчаць надзвычайнае становIшча у асобных рэгIёнах СССР толькI са згоды адпаведных органау дзяржаунай улады рэспублIк " у Iнтарэсах гарантавання бяспекI грамадзян СССР пры стыхIйных бедствах, буйных аварыях або катастрофах, эпIзаотыях, а таксама пры масавых беспарадках". ТакIм чынам, законных падставау для увядзення надзвычайнага становIшча у БеларусI I СССР няма. Разам з тым, праз I0 гадзIн пасля абвяшчэння надзвычайнага становIшча, адсутнIчае Заява ПрэзIдэнта СССР М.С.Гарбачова аб дабраахвотным складаннI сваIх паунамоцтвау I медыцынскае заключэнне аб стане яго здароу'я. У сувязI з гэтым, законным кIраунIком Саюза ССР застаецца ПрэзIдэнт СССР, якI можа быць адхIлены ад сваёй пасады не менш як 2/3 галасоу ад агульнай колькасцI З'езда народных дэпутатау СССР.

Здзейсненым I8-I9 жнIуня г.г. актам бальшавIкI-камунIсты яшчэ раз пацвярджаюць сваю прыхIльнасць да гвалтоунага вырашэння сацыяльных I Iншых праблем. Мы маем дачыненне з таталIтарысцкIмI прыёмамI захопу улады.

Дэпутаты ад апазIцыI у Вярхоуным Савеце Беларускай ССР заклIкаюць усIх грамадзян БеларусI захоуваць арганIзаванасць, вытрымку I дысцыплIну, выконваць толькI рашэннI канстытуцыйных органау улады. ЗаклIкаем нашых выбаршчыкау праводзIць, пачынаючы з 20 жнIуня, пасля I8 гадзIн, сустрэчы з народнымI дэпутатамI усIх узроуняу I запатрабаваць спынення дзейнасцI незаконнага "Дзяржаунага КамIтэта па

надзвычайным становІшчы" у СССР.

Мы звяртаемся да ваеннаслужачых СавецкІх Узброеных СІл, супрацоунІкау МУС І КДБ БССР з заклІкам захоувадь вернасць КанстытуцыІ Беларускай ССР І Саюза ССР, свайму службоваму абавязку, пазбягаць ужывання сІлы І устрымацца ад падтрымкІ неканстытуцыйных органау.

АпазІцыя у Вярхоуным Савеце Беларускай ССР патрабуе тэрмІновага склІкання надзвычайнай СесІІ ВС БССР для абмеркавання становІшча, што склалася, І прыняцця неабходных мер.

1. Я. Навікоў, 13 я
2. Л. Баршчэўскі, 174-я акруга
3. Л. Зданевіч, 39-я акруга
4. В. Голубеў 15 я акруга
5. І. Герменчук 71-я акруга
Глюкебер Б.Ю 190 акруга
7. А.А. Трусаў 33 акруга
8. М.К. Крыжаноўскі 86 акруга
9. С. Папкоў 21 акруга
10. Я. Цумараў 10-я акруга
11. Г. Грушавой 41-я акруга
12. Ю. Беленькі 36-я акр.
13. Л. Дзейка 62-я акр.
14. У. Новік 18-я акр.
15. У. Станкевіч 78-я
16. У. Заблоцкі 35-я
17. С. Наўмчык 181-я
18. [illegible]
19. З. Пазьняк – 9-я